

# Воблака прэтэнзій

— Ну, як там твая дачка?

— Бы сыр у масле качаецца. Кожныя тры месяцы муж на мора возіць, штогод новае футра купляе...

— А сын?

— А вось сын — так сабе. Жонка яму не вельмі трапілася. То ёй на мора трэба, то футра новае патрабуе...

Жарты жартамі, але са свякрухамі ды цешчамі шанцуе не ўсім... Не пашанцавала і маёй знаёмай. «Свякроў празмерна нас апякае, лезе ўсюды, усё імкнецца кантраляваць, — жаліцца яна. — Пакуль не было дзіцяці, дык яшчэ нічога. Жывём жа, дзякуй Богу, у розных гарадах. Але вось калі нарадзілася дачушка, мама мужа прыехала да нас пагасціць на месяц, каб мне дапамагчы. Але ж навошта мне такая дапамога! Яна ж літаральна выдзірае з рук немаўля: «Ты не так купаеш, не так корміш, не так выхоўваеш». Я моўчкі трываю ўсе прэтэнзіі і штодзень плачу ў падушку... За ўвесь год, што прайшоў пасля вяселля, столькі не плакала, колькі з яе прыездам. Ды і з мужам адносіны пагоршыліся. Яго як падмянілі. Пастаянна раздражнёны. Лічу дні да таго моманту, калі яна з'едзе...»

Памятаю, як я — студэнтка-першакурсніца — таксама штораз, калі прыязджала на выхадныя праведаць бацькоў, рыдала. А ўсё з-за таго, што маме не падабалася, як я апранаюся. Ніколі не забудуся, як мы паехалі на кірмаш па зімовую куртку. Прахадзілі там па холадзе не адну гадзіну, перамералі тысячу абновак. Але мне так нічога і не спадабалася. У выніку я вярталася дадому ўся заплаканая ў ярка-чырвонай куртцы з залацістымі гузікамі. Мама, відаць, была задаволена пакупкай, але я так больш ні разу яе і не апранула. Яна ж пра гэта не ведала, таму па-ранейшаму набывала мне розныя рэчы і перадавала ў Мінск. Пакуль я не зразумела, што так больш працягвацца не можа. У мяне свае густы. У мамы свае. Таму, калі я чарговы раз прыехала дадому, і мы зноў пасварыліся, прапанавала ёй пагаварыць шчыра. Я сказала, што цаню яе клопат. Але, разам з тым, папрасіла паважаць і мой выбар. У той вечар мы абняліся, паплакалі разам. І цяпер, калі мама хоча мяне парадаваць, то дае грошы, маўляў «купі сабе тое, што спадабаецца». Часам, вельмі рэдка, яна па інерцыі пачынае заводзіць размову пра «класічны касцюмчык» і «туфлі на абцасіку». На што я аджартоўваюся, маўляў, давай табе лепш усё гэта купім. І мама тут жа з усмешкай успамінае маю просьбу і спыняецца...

Тое ж самае я параіла зрабіць і сваёй знаёмай. Сесці і проста пагаварыць з мамай мужа адкрыта. Хто ведае, можа, пасля шчырай размовы яны стануць лепшымі сяброўкамі? А такія прыклады ёсць. Ведаю адну паспяховую жанчыну, кіраўніцу. Яна, нягледзячы на тое, што развялася з мужам, працягвае сябраваць з яго маці. Яны разам ходзяць у кіно, па пакупкі... Давяраюць адна адной свае самыя патаемныя сакрэты. «Як такое можа быць?» — дзіўлюся. — «Яна проста паважае маё рашэнне, а не папракае, не вінаваціць. Дазваляе мне заставацца самой сабой. А гэта ў наш час такая рэдкасць».

Нейкі час я наймала кватэру разам з сяброўкай і яе мужам. Алег чамусьці пастаянна рабіў мне заўвагі, таму асацыяваўся ў мяне з «воблакам прэтэнзій». Я спачатку спрабавала апраўдацца, паспрачацца, адказвала на заўвагу заўвагай. Але потым змяніла тактыку. На чарговую заўвагу: «Вось, пасля зімы ў маім ровары пашкодзіўся правадок, гэта, пэўна, ты неакуратна яго перастаўляла, як мыла падлогу... Пастарайся наступным разам рабіць усё акуратней». — «Гэта ж зразумела. Я заўсёды з рэчамі, тым больш чужымі, абыходжуся ахайна», — сказала я спакойна ў адказ. Алег прамаўчаў. Было відаць, што ён ніяк не чакаў такога адказу. А праз хвіліну зайшоў у пакой і выбачыўся, маўляў, «можа, гэта я сам зачапіў і не прыкмеціў».

Бацькоў, як сваіх, так і мужа, мы не выбіраем. Але ж мы вольныя выбіраць рэакцыю на тое, што адбываецца. І гэта адзінае, што ў нас ніхто не можа адняць.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Сямейная газета

Выпуск № 13 (56)

■ Тыя, хто побач

# ТАТА Ў ДЭКРЭЦЕ



Фота Надзеі БУЖАН.

**У нашай краіне ўсяго толькі 1% татаў карыстаюцца законным правам пайсці ў адпачынак па доглядзе дзіцяці. З іх ліку і бас-гітарыст гурта J:МОРС Валерый ДАСЮКЕВІЧ. Музыкант запрасіў нас дадому, дзе за кавай і ў перапынку паміж гульнёй з сынам падзяліўся сваім амаль трохгадовым досведам «вусатага няня».**

## «Мама ж у нас — дырэктар»

*Пакуль тата заварваў каву, Макар паспеў пазнаёміць нас са сваім беласнежным катом Багзам, паказаць «БМВ» з пультам кіравання і драўляную чыгунку з цягнікамі...*

— Макарчык, вазьмі трубачку, мама нешта хоча табе сказаць, — даносіцца з кухні голас таты і хлопчык тут жа забываецца на нас ды на свае цацкі.

***— Чыё гэта было рашэнне — афарміць водпуск па доглядзе дзіцяці? — цікаўлюся ў Валерыя, пакуль Макар размаўляе па тэлефоне.***

— Агульнае. Усе цудоўна разумелі, што Іра не зможа сядзець у дэкрэце. Мама ж у нас — дырэктар, праўда Макар? *(падміргвае сыну).* Знайсці ёй замену на тры гады не так проста. Калі сын нарадзіўся, яна на 30 дзён узяла адпачынак. А пасля я прыняў удар на сябе *(смяецца).* Я ж на завод не хаджу. Рэпетыцыі ды канцэрты ў мяне, як правіла, па вечарах, выхадных і святочных днях, калі мама дома. Мы з Ірай шмат ездзім па свеце і бачым, што за мяжой мужчыны прымаюць непасрэдны ўдзел у выхаванні дзяцей. А я чым горшы? У мяне сяброў шмат такіх жа. Такія ўжо таты, да мозгу касцей.

***— Не было вам страшна заставацца з маленькім сам-насам?***

— Не. Наадварот, было вельмі цікава. Столькі ўсяго новага для сябе адкрыў. Мы ж яго нарадзілі не ў 18 гадоў. Мне было 32. Таму я падышоў да бацькоўства свядома. Цудоўна разумеў, што будзе цяжкавата спачатку. Бяссонныя ночы, першыя зубкі, палікінікі... Нам пашанцавала з бабуляй: Ірына мама вельмі дапамагае. І нянечка заўсёды на падхваце. У мяне ж дзень на дзень не прыходзіцца. Часам даводзіцца і пасярод тыдня на гастролі з'ехаць.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***

■ Увага! Новы фотаконкурс!

# БЕЛАРУСІКІ

**Шаноўныя, мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у новым конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымачкі вашых дачушак і сыночкаў, унучкаў і ўнучачак, а мо нават і праўнукаў (з невялічкім (4-5 сказаў) аповедам пра фота) на адрас «Звязды» з пазнакай «Сямейная газета. Беларусікі». Але адна ўмова — каб зірнуўшы на фота, адразу ж было зразумела, што гэта «беларусік». Арыгінальнасць і творчы падыход вітаецца! Аднаго з беларусікаў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз.**



А распачаць рубрыку мы вырашылі здымкамі аўтара нашай пастаяннай рубрыкі «Нататкі таткі» Аляксандра Алесіка. «Трэці год напярэдадні Купалля мы фатаграфуем нашу Васілісу з валошкавым вянком. Нават не магу сказаць, як узнікла гэта ідэя. Хацелася зрабіць нешта такое, што не проста б фіксавала на памяць моманты дзяцінства дачушкі, але і было сімвалічным, звязаным з нашай культурай. Усё неяк само склалася ў адно цэлае: Васіліса — валошкі — вянок — Купалле... Вось так нарадзілася наша прыгожая сямейная традыцыя, якая, спадзяюся, абавязкова будзе працягвацца».

